некоторые подтверждения. Во-первых, в то время ВКП(б) уже отказалась от идеи перманентной революции. Была свернута и подготовка к восстанию в Западной Белоруссии. И первое, и второе были хорошо известны руководству БССР, и рассчитывать на изменение западной границы каким-либо иным образом в то время было невозможно. Во-вторых, статья касается Конституции СССР и, возможно, подразумевает изменение границ в данном государстве. В-третьих, как известно, не все земли, на которые претендовала БССР, были включены в нее во время укрупнений в 1924 и 1926 г.

С точки зрения развития идеи белорусской государственности это означает, что руководство БССР, вынужденное отказаться от государственного суверенитета, сосредоточило свое внимание на тех сферах, где еще было возможно национально-государственное творчество, это культурное возрождение и собрание этнографических земель Беларуси, и в 1927 г. не считалось необходимым сворачивать эти процессы.

ЛИТЕРАТУРА

1. НАРБ. Ф. Воп. 3. Спр. 6. Л. 451.
2. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1973. – Т.1. – 527 с.
3. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі. Афіцыйнае выданьне. Менск. 1927. – 15 с.

УДК 39(476+474.3)«1918/1939»

В. У. Коваль, канд. гіст. навук, дац.
(БДТУ, г. Мінск)

## ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ЛАТВІІ (1918–1939 гг.)

Культурная дзейнасць беларускай дыяспары фарміравала ў асяроддзі замежжа пачуццё нацыянальнай годнасці, адчуванне значнасці і непаўторнасці мінулага свайго народа. Беларусы Латвіі ў міжваенны перыяд сфармавалі адметны культурна-асветніцкі цэнтр пры дзяржаўнай падтрымцы латышскага ўраду. Фармаванне беларускай дыяспары ў Латвіі адбывалася ў міжваенны час, у перыяд станаўлення і развіцця дзяржаўнасці латышскага народа.

У 1920-я гг. Міністэрства асветы Латвіі развівала мадэль культурна-нацыянальных аўтаномій для нацыянальных меншасцей краіны. На грамадскую актыўнасць беларусаў Латвіі непасрэдны ўплыў

аказвала афіцыйная дзяржаўная палітыка, шмат якія працэсы адлюстроўвалі кан’юнктурны момант і палітычны курс краіны. У 1921 г. было створана Беларускае ўпраўленне пры Міністэрстве асветы Латвіі, якое працягвала сваю працу да 1934 г.

Беларусы Латвіі пражывалі кампактна ў Латгаліі і Земгале. Афіцыйная статыстыка не зусім поўна адлюстроўвае колькасць беларускага насельніцтва, асабліва спрэчнымі з’яўлюцца даныя 1930-х гг. Падчас народнага перапісу 1920 г. было зарэгістравана 75 тыс. беларусаў, у 1925 г. – 38 тыс., у 1930 г. – 36 тыс., а ў 1935 г. – 27 тыс. беларусаў [1, с. 76]. Асноўная частка беларускай супольнасці прадстаўляла каталікоў па веравызнанні.

Негатыўны ўплыў на развіццё нацыянальнай актыўнасці беларусаў Латвіі аказаў гучны палітычны «беларускі працэс» (1924–1925 гг.) і сусветны эканамічны крызіс. У выніку «беларускага працэсу» вядомыя грамадскія дзеячы і педагогі былі абвінавачаны ў стварэнні антыдзяржаўнага руху. Па прычыне рэзананснай крымінальнай справы ўлады на працяглы час прыпынілі дзейнасць Беларускага ўпраўлення адукацыі ў 1925 г. Суд прыняў пастанову выселіць з тэрыторыі Латвіі найбольш актыўных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху.

Беларуская дыяспара Латвіі адрознівалася сваімі сталымі кантактамі з метраполіяй, арыентацыяй на культурныя адметнасці свайго народа. Беларусы стварылі грамадскія арганізацыі, сярод якіх варта вылучыць дзейнасць наступных таварыстваў: «Бацькаўшчына», «Беларуская хата», «Рунь», «Прасвета», Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі, сельскагаспадарчае таварыства «Араты», Таварыства беларускіх настаўнікаў, Таварыства беларусаў–выбаршчыкаў, Таварыства беларускага тэатра ў Латвіі.

Асаблівая ўвага ў сучаснай этнапсіхалогіі надаецца культурнай ідэнтычнасці пры аналізе дыяспаральных працэсаў. Згодна сучаснай канцэпцыі шматграннай ідэнтычнасці, агульная ідэнтычнасць асобы складаецца з асобных: этнічнай, рэлігійнай, культурнай, прафесійнай, класавай, узроставай і інш. Этнічнасць членаў дыяспары салідарызуе іх на аснове групавога членства. Неабходна падкрэсліць, што кожны культурны асяродак беларускага замежжа ствараў сваю непаўторную сістэму каштоўнасцей як фактараў этнічнай самаідэнтыфікацыі. Умоўны дыялог паміж метраполіяй і замежжам аказваў непасрэдны ўплыў на культурную ідэнтыфікацыю асоб. Адметнасцю культурнага жыцця беларусаў Латвіі стала шанаванне традыцый народнага тэатра, выяўленчага мастацтва, музычнай культуры, літаратурнай спадчыны, што стымулявала грамадскую актыўнасць дыяспары.

На фармаванне культурнай, нацыянальнай, этнічнай ідэнтычнасці адметны ўплыў аказвала сістэма адукацыі. Настаўнікі беларускіх школ актыўна выкарыстоўвалі этнічную педагогіку ў сваім вучэбна-выхаваўчым працэсе, які спрыяў развіццю самаідэнтыфікацыі на аснове народнай культуры беларусаў. У пачатку 1920-х гг. у Латвіі працавала больш за 50 беларускіх школ, аднак паступова іх колькасць скарачалася. Самымі вядомымі беларускімі навучальнымі ўстановамі Латвіі былі: Дзвінская беларуская гімназія (адчынена ў 1922 г.), Люцынская беларуская гімназія (адчынена ў 1922 г.), Шылаўская беларуская прыватная школа (адчынена ў 1927 г.), Рыжская прыватная дадатковая школа (адчынена ў 1927 г.), Рыжская прыватная гімназія (адчынена ў 1929 г.). Беларуская моладзь набывала адукацыю ў вышэйшых навучальных установах Латвіі, беларусы вучыліся ў Латвійскім універсітэце, Латвійскай акадэміі мастацтваў, Латвійскай кансерваторыі, Рыжскай духоўнай семінарыі.

Асобная тэма даследавання культурнай спадчыны беларусаў Латвіі – гэта шматгадовае супрацоўніцтва вядомага латышскага паэта і грамадскага дзеяча Яна Райніса з беларускай дыяспарай. Паэт паспяхова вырашаў актуальныя пытанні беларускіх школ праз Міністэрства асветы, развіваў асабістыя кантакты з творчымі асобамі, што няспынна павялічвала колькасць прыхільнікаў яго паэзіі сярод беларусаў. Беларуская грамада горача вітала прызначэнне Яна Райніса на пасаду Міністра асветы Латвіі ў 1927 г.

Культурнае жыццё беларускай супольнасці Латвіі адрознівалася выключнай увагай да тэатральнага мастацтва. Беларускі тэатр у Рызе спрабавалі арганізаваць некалькі разоў, аднак першыя спробы скончыліся няўдала. Ідэя стварэння нацыянальнага тэатра ў Рызе гучала ў беларускай супольнасці неаднаразова. Лепшых артыстаў запрашалі ў Рыгу для рэалізацыі праекта, аднак артыстам-аматарам не хапала сродкаў для наладжвання побыту ў латышскай сталіцы, таму моладзь хутка вярталася дадому. Адметным мастацкім густам вылучыліся пастаноўкі Дзвінскай і Люцынскай беларускіх гімназій, нестандартнымі творчымі рашэннямі вызначыліся драматычныя гурткі пры таварыствах «Рунь», «Беларуская хата», «Бацькаўшчына».

У 1927 г. у Рызе было створана Таварыства беларускага тэатра, якое паспяхова справілася з кансалідуючай функцыяй. Перад спектаклямі таварыства была закладзена традыцыя – чытаць лекцыі па гісторыі і культуры Беларусі, у якіх асаблівая ўвага надавалася пытанню развіцця нацыянальнай ідэі. Віленская газета “Сялянская ніва” адзначала поспехі тэатральнай арганізацыі беларусаў Латвіі: “Дзьвінскі ад-

дзел Т-ва, прыступіўшы да другога году сваёй працы, шырока разьвярнуў сваю дзейнасьць. Да гэтага часу наладжаны вечарыны: 8-га сьнежня 1929 году ў Дзьвінску і 9-га сьнежня ў Грыве. Абодва спэктаклі-вечарыны выклікалі шырокую зацікаўленасьць беларускага грамадзянства” [2, с. 3]. Найбольшай папулярнасцю гледачоў карысталіся п’есы Я. Купалы, Ф. Аляхновіча, В. Дуніна-Марцінкевіча.

Палітыка развіцця культурна-нацыянальных аўтаномій спрыяла актыўнай рабоце беларускай супольнасці. Аднак дзяржаўны пераварот 1934 г., які прывёў да ўлады К. Улманіса, абмежаваў грамадскае і культурнае развіццё нацыянальных меншасцей. Манаполія на ўладу прэзідэнта міністраў К. Улманіса спыніла дэмакратычныя тэндэнцыі развіцця латышскай дзяржаўнасці. Пасля перавароту ўлады пачалі масава зачыняць грамадскія арганізацыі, перыядычныя выданні і школы нацыянальных меншасцей, што стала прычынай ліквідацыі асноўнай часткі беларускіх арганізацый, газет і часопісаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Екабсонс Э. Культурная деятельность белорусов Латвии в 1918–1940 годах // Латвія – Беларусь: дыялог двух культур: матэрыялы I навук.-практ. канф., Рыга, 4 снежня 2004 г. Рыга: Саюз беларусаў Латвіі, 2005. С. 76–90.

2. А. Б. Праца Беларускага Тэатральнага Т-ва // Сялянская ніва. – № 1 (188). – 1929. – С. 3.

УДК 94(476)

І. А. Андарала, канд. пед. навук, дац.
(БДТУ, г. Мінск)

## АДНАЎЛЕННЕ СЕТКІ ШКОЛ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫ ПАСЛЯВАЕННЫ ВУЧЭБНЫ ГОД

Аналіз гістарыяграфічных крыніц сведчыць, што стан школьнай адукацыі рэспублікі ў першы пасляваенны год знайшоў пэўнае асвятленне ў дысертацыйных даследаваннях навукоўцаў савецкага перыяду, якія апісвалі поспехі БССР у культурнай рэвалюцыі, дасягнутыя пад кіраўніцтвам КПСС. Для доказу поспехаў імі, як правіла, прыводзіліся лічбы, якія сведчылі аб хуткім росце сеткі школ і навучэнцаў у іх. У той жа час пытанні стану вучэбна-метадычнай гаспадаркі школ, будаўніцтва і рамонту школьных будынкаў і памяшканняў, выканання закону аб усянавучы, якія выключна востра стаялі і вельмі складана ра-